# За справядлівае вырашэнне алжырскага пытання

**Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР К. В. КІСЯЛЁВА на пасяджэнні Палітычнага камітэта 11 снежня 1958 года**

Пан старшыня,
Панове дэлегаты.

Мы распачалі абмеркаванне алжырскага пытання, унесенага 24 дэлегацыямі краін Азіі і Афрыкі. Алжырскае пытанне ўжо чацвёрты раз выносіцца на разгляд Генеральнай Асамблеі. Аднадушна прынятая рэзалюцыя XII сесіяй Генеральнай Асамблеі, якая заклікае да мірных перагавораў для дасягнення рашэння ў адпаведнасці з мэтамі Статута ААН, павісла ў паветры і не была ажыццёўлена. Кровапралітная вайна ў Алжыры працягваецца. Яна нясе з сабой велізарныя чалавечыя ахвяры, разбурэнне матэрыяльных каштоўнасцей, цяжкія пакуты народа гэтай краіны. Усім зразумелы сэнс і прычыны гэтых трагічных падзей. У Алжыры ідзе тыповая каланіяльная вайна. Нельга без хвалявання чытаць дакументы, прадстаўленыя алжырскім Нацыянальным фронтам вызвалення, у якіх апісваюцца тэрор і зверствы французскіх каланіяльных войск у адносінах да алжырскага насельніцтва.

Прыведзеныя ў шаленства супраціўленнем арміі Нацыянальнага вызвалення, французскія ваенныя ўлады жорстка распраўляюцца з безабаронным алжырскім насельніцтвам. Рэпрэсіі французскіх каланізатараў не навінка. Гэта праяўленне пастаяннай каланіяльнай палітыкі, якая ідзе сваімі карэннямі да першых гадоў французскага захопу Алжыра ў 1830 годзе. Сёння ў Алжыры знаходзіцца 600 тысяч французскіх салдат — каласальны ваенны апарат і жандармерыя, якія займаюцца так званым «ўціхамiраннем» Алжыра, г. зн. вядуць сапраўдную вайну супраць алжыр-

Пан старшыня!

Нягледзячы на цэлы рад буйных ваенных аперацый французскай арміі супраць войск Нацыянальнага фронта вызвалення Алжыра, нягледзячы на тэрор і рэпрэсіі супраць мірнага насельніцтва, нягледзячы на велізарную дапамогу, якую французскія каланізатары атрымліваюць ад сваіх саюзнікаў па НАТО, нацыянальна-вызваленчая барацьба алжырскага народа працягваецца, яна ўсё больш расце і шырыцца. Няўдачы і паражэнні французскіх каланізатараў тлумачацца тым, што нельга перамагчы народ, які ўзняўся на абарону сваёй свабоды і незалежнасці, які вядзе барацьбу за справядлівую справу, за выгнанне са сваёй зямлі чужаземных захопнікаў. Алжырскі народ нельга перамагчы яшчэ і таму, што ён штодзённа адчувае маральную падтрымку міралюбівых народаў усяго зямнога шара. Усё перадавое чалавецтва са спачуваннем і надзеяй сочыць за мужнай барацьбой алжырцаў супраць каланіяльнага прыгнёту.

Правячыя колы Францыі, ведучы каланіяльную вайну супраць алжырскага народа, стараюцца паказаць становішча рэчаў такім чынам, быццам гэта ўнутраная справа Францыі. Аднак гэта нікога не можа пераканаць.

Спадзеючыся ўвесці ў зман сусветную грамадскую думку адносна сапраўднага характару падзей у Алжыры, французскі

для алжырскага насельніцтва. Каб не быць галаслоўным, дазвольце прывесці факты. У цяперашні час у Алжыры налічваецца 10 мільёнаў насельніцтва, сярод якога 1.200.000 еўрапейцаў. З гэтага насельніцтва 2.400.000 дзяцей алжырцаў не атрымліваюць ніякай адукацыі. Адсутнасць школ і настаўнікаў для алжырцаў стварыла становішча, пры якім больш як 86 працэнтаў мясцовага насельніцтва з'яўляецца непісьменным. Звыш стагоддзя родная для гэтай краіны арабская мова разглядаецца французскімі ўладамі як замежная. Навучанне ў школах вядзецца на французскай мове.

Узровень жыцця алжырцаў вельмі нізкі. Насельніцтва сістэматычна недаядае. Каланіяльныя ўлады трымаюць алжырскі народ у невуцтве і галечы, прымушаючы яго працаваць на любых умовах. Галеча пануе ў алжырскіх вёсках. Іх жыхары жорстка эксплуатуюцца. Лепшыя землі, як правіла, належаць французскім каланістам. Яшчэ ў больш цяжкім становішчы знаходзяцца сотні тысяч беспрацоўных Алжыра, пры чым беспрацоўе мае месца выключна сярод арабскага насельніцтва краіны. Эканоміка Алжыра знаходзіцца ў заняпадзе. Вось, па нове, факты, якія характарызуюць гарот нае становішча працоўнага насельніцтва.

Алжырскі народ у сваёй барацьбе н адзінокі. Трэба сказаць, што салідарнасць ім працягвае расці. Так, канферэнцыя салідарнасці краін Азіі і Афрыкі ў снеж 1957 года, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі 45 краін, рашуча асудзіла каланіяльную вайну Францыі ў Алжыры і запатрабавала прызнання незалежнасці алжырскага народа. 30 сакавіка 1958 года па р

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы